# КНІГА ПРАРОКА САФОНА

1 Слова Гасподняе, якое было Сафону, сыну Хусіі, сыну
Гадаліі, сыну Амарыі, сыну Эзэкіі, у дні Ісаі, сына
Амонавага, сына Юдавага.
2 Усё зьнішчу з аблічча зямлі, - кажа Гасподзь:
3 зьнішчу людзей і быдла, зьнішчу птушак нябесных і
рыб марскіх, і спакусы разам зь бязбожнымі; зьнішчу
людзей з улоньня зямлі, кажа Гасподзь.
4 І працягну руку Маю на Юдэю і на ўсіх жыхароў
Ерусаліма: зьнішчу зь месца гэтага рэшткі Ваала, імя
жрацоў са сьвятарамі,
5 і тых, якія на дахах пакланяюцца воінству
нябеснаму, і тых паклонцаў, якія запрысягаюцца
Госпадам і запрысягаюцца царом сваім,
6 і тых, якія адступіліся ад Госпада, ня шукалі Госпада
і ня пыталіся пра Яго.
7 Змоўкні перад абліччам Госпада! бо блізкі дзень
Госпада: ужо падрыхтаваў Гасподзь ахвярны закол,
назначыў, каго паклікаць.
8 І будзе ў дзень ахвяры Гасподняй: Я наведаю
князёў і сыноў цара і ўсіх, хто апранаецца ў вопратку
іншапляменцаў;
9 наведаю ў той дзень усіх, якія пераскокваюць цераз
парог, якія дом Госпада свайго напаўняюць гвалтам і
ашуканствам.
10 І будзе ў той дзень, кажа Гасподзь, лямант каля
брамаў рыбных і галашэньне каля іншых брамаў і
вялікае разбурэньне на пагорках.
11 Галасеце, жыхары ніжняга горада, бо зьнікне
ўвесь гандлёвы люд, і вынішчаны будуць абцяжаныя
срэбрам.

12 І будзе ў той час: Я са сьвяцільняю агледжу
Ерусалім і пакараю тых, якія сядзяць на дрожджах
сваіх і кажуць у сэрцы сваім: «ня робіць Гасподзь ні
дабра ні ліха», -
13 і абернуцца багацьці іхнія здабычаю і дамы іхнія
- запусьценьнем: яны пабудуюць дамы, а жыць у
іх ня будуць; насадзяць вінаграднікі, а віна зь іх ня
піцьмуць.
14 Блізкі вялікі дзень Госпада, блізкі - і вельмі
сьпяшаецца: ужо чуцен голас дня Господняга. Горка
заенчыць тады і самы адважны!
15 Дзень гневу - дзень гэты, дзень скрухі і ўціску, дзень
спусташэньня і плягі, дзень цемры і змроку, дзень
воблака і мглы,
16 дзень трубы і ваяўнічага крыку супроць
умацаваных гарадоў і высокіх вежаў.
17 І Я ўцісну людзей, і яны будуць хадзіць, як сьляпыя,
бо яны зграшылі супроць Госпада, і раскідана будзе
кроў іхняя, як тло, і плоць іхняя - як памёт.
18 Ні срэбра іхняе, ні золата іхняе ня зможа
выратаваць іх у дзень Госпада, і агнём палкасьці
Ягонай зжэртая будзе ўся гэта зямля, бо
вынішчэньне, раптоўнае, зьдзейсьніць Ён над усімі
жыхарамі зямлі.

# Саф 2

1 Дасьледуйце сябе ўважліва, дасьледуйце люд
неакілзаны,
2 пакуль ня прыйшло вызначэньне - дзень праляціць,
як мякіна - пакуль ня прыйшоў на вас палымяны
гнеў Гасподні, пакуль не настаў вам дзень лютасьці
Гасподняй.
3 Знайдзеце Госпада, усе пакорліўцы зямлі,
выканаўцы законаў Яго; знайдзеце праўду, знайдзеце

пакорлівую мудрасьць; можа стацца, вы схаваецеся ў
дзень гневу Гасподняга.
4 Бо Газа будзе пакінутая і Аскалон апусьцее, Азот
будзе выгнаны сярод дня і Экрон выкараніцца.
5 Гора жыхарам прыморскай краіны, народу
Крыцкаму! Слова Гасподняе - на вас, Хананэі, зямля
Філістымская! Я зьнішчу цябе, і ня будзе ў цябе
жыхароў,
6 і будзе прыморская краіна пастушынай аўчарняй і
кашарай пад быдла.
7 І дастанецца гэты край рэшце дому Юдавага, і будуць
пасьвіць там, і ў дамах Аскалона будуць вечарам
адпачываць, бо Гасподзь Бог іх наведае і верне палон
іхні.
8 Чуў Я паганьбеньне Маава і лаянку сыноў Амонавых,
як яны зьдзекаваліся з Майго народу і велічаліся на
межах ягоных.
9 Таму, жыву Я! кажа Гасподзь Саваоф, Бог Ізраілеў:
Мааў будзе, як Садома, і сыны Амона будуць, як
Гамора, здабыткам крапівы, салянаю калдобінаю,
пусткаю навекі; рэшта народу Майго возьме іх
здабычаю, і ацалелыя зь людзей Маіх атрымаюць іх у
спадчыну.
10 Гэта ім - за пыху іхнюю, за тое, што яны
зьдзекаваліся і велічаліся над народам Госпада
Саваофа.
11 Страшны будзе для іх Гасподзь; бо вынішчыць усіх
багоў зямлі, і Яму будуць пакланяцца - кожны месца
зь месца свайго - усе выспы народаў.
12 І вы, Эфіопы, пабітыя будзеце мечам Маім.
13 І працягне Ён руку Сваю на поўнач - і зьнішчыць
Асура і ператворыць Нінэвію ў руіны, у месца сухое,
як пустыня,
14 і пакоіцца будуць сярод яе statkі і ўсякага роду
жывёлы; пелікан і вожык будуць начаваць - у

розных аздобах яе; голас іхні будзе гучаць у вокнах,
разбурэньне выявіцца на касяках дзьвярэй, бо не
застанецца на іх кедровай шалёўкі.
15 Вось чым будзе горад пераможна-радасны, які
жыве бесклапотна, які кажа ў сэрцы сваім: «я - і
няма іншага апроч мяне». Як ён зрабіўся руінаю,
логвішчам для зьвяроў! Кожны, праходзячы міма яго,
пасьвішча й рукою махне.

# Саф 3

1 Гора гораду нячыстаму і апаганенаму,
прыгнятальніку!
2 Ня слухае голасу, ня прымае настаўленьняў,
на Госпада не спадзяецца, да Бога свайго не
набліжаецца.
3 Князі яго сярод яго - рыклівыя ільвы, судзьдзі
яго - вечаровыя ваўкі, якія не пакідаюць да раніцы
ніводнай косткі.
4 Пракрокі яго - людзі легкадумныя, вераломныя;
сьвятары яго апаганьваюць сьвятыню, топчуць закон.
5 Гасподзь праведны пасярод яго, ня чыніць
няпраўды, кожнае раніцы яўляе суд свой нязьменна;
але беззаконьнік ня ведае сораму.
6 Я вынішчыў народы, разбурыў цьвярдыні іхнія;
спустошыў вуліцы іхнія, так што ніхто ўжо ня ходзіць
па іх; спляжаны гарады іхнія: няма ніводнага
чалавека, няма жыхароў.
7 Я казаў: «бойся толькі Мяне, прымай
настаўленьне»! і ня будзе зьнішчана жытлішча
ягонае, і не спасьцігне яго ліха, якое Я пастанавіў яму;
а яны рупліва стараліся псаваць усе свае дзеяньні.
8 Дык вось, чакайце мяне, кажа Гасподзь, да таго
дня, калі Я паўстану дзеля спусташэньня, бо Мною
вызначана сабраць народы, склікаць царствы, каб

выліць на іх абурэньне Маё; бо агнём палкасьці Маёй
зжэрта будзе ўся зямля.
9 Тады зноў Я дам народам вусны чыстыя, каб усе
заклікалі імя Госпада і служылі Яму аднадушна.
10 З пазарэчных краін Эфіопіі прыхільнікі Мае - дзеці
расьсеяных Маіх - прынясуць Мне дарункі.
11 У той дзень ты ня будзеш сарамаціць сябе
рознымі ўчынкамі тваімі, якімі ты грашыў супроць
Мяне, бо тады Я выдалю спасярод цябе тых, якія
марнаслаўяцца тваёй знакамітасьцю, і ня будзеш
болей упадаць у пыху на сьвятой гары Маёй.
12 Але пакіну сярод цябе народ пакорлівы і просты, і
яны будуць спадзявацца на імя Гасподняе.
13 Рэшта Ізраіля ня будзе рабіць няпраўды, ня будзе
гаварыць маны, і ня знойдзецца ў вуснах у іх языка
падступнага, бо самыя будуць пасьвіцца і пакоіцца, і
ніхто не патрывожыць іх.
14 Радуйся, дачка Сіёна! трыюмфуй, Ізраіле! Весяліся
і радуйся ад усяго сэрца, дачка Ерусаліма!
15 Адмяніў Гасподзь прысуд над табою, прагнаў
ворага твайго! Гасподзь, цар Ізраілеў, пасярод цябе:
ужо болей ня ўбачыш ліха.
16 У той дзень скажуць Ерусаліму: «ня бойся», і Сіёну:
«хай жа ня слабнуць рукі твае!
17 Гасподзь Бог твой сярод цябе: Ён мае сілу ўратаваць
цябе; узьвяселіцца за цябе радасьцю, будзе літасьцівы
паводле любові Сваёй, будзе радавацца за цябе зь
весялосьцю».
18 Наракальнікаў на радасныя сьвяты Я зьбяру; твае
яны, на іх цісьне паганьбеньне.
19 Вось, Я ўцісну ўсіх уціскальнікаў тваіх у той час
і выратую кульгавае, і зьбяру расьсеянае, і прывяду
іх у пашану і знакамітасьць на ўсёй гэтай зямлі
паганьбеньня іхняга.

20 У той час прывяду вас і тады зьбяру вас; бо зраблю вас знакамітымі і ганаровымі сярод усіх народаў зямлі, калі вярну палон ваш перад вачыма вашымі, кажа Гасподзь.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc